*собственного носа; to look down a nose at somebody — задирать нос; a toot for a tooth — зуб за зуб; armed to the teeth — вооружён до зубов; to have lost a tongue — язык проглотить; to wag a tongue — языком трепать; to have heart of gold — иметь золотое сердце; to have heart of kind — иметь доброе сердце; with a heavy heart — камень на сердце, с тяжёлым сердцем.*

**Заключение.** Заимствование слов из других языков — естественный, необходимый и реально существующий процесс, который обусловлен международными связями. Однако обилие в речи неосвоенных, непонятных широкому кругу людей иностранных слов затрудняет общение. Бороться надо не с самими заимствованиями, а со злоупотреблением ими или с неуместным их применением. Неуместное, неточное употребление иностранных слов портит и засоряет нашу речь. Хорошее знание языка невозможно без знания его фразеологизмов. На примере рассмотренных единиц можно отчётливо представить, как разнообразны и выразительны фразеологизмы современного английского и русского языков, насколько они сходны и/или различны между собой. В отличие от тех фразеологизмов, которые приобрели межъязыковую эквивалентность вследствие заимствований, сходство фразеологизмов в образной и стилистической окраске обусловлено простым совпадением. Общие и отличительные свойства образных средств родного и английского языков помогает увидеть единство и своеобразие языковых единиц, ведь соотношение этих образов — очень интересный феномен в языкознании.

**Список цитируемых источников**

1. Шишонина Н. В. Иностранный язык в современной межкультурной коммуникации // Наука и образование в XXI веке : сб. науч. трудов по материалам Междунар. науч.-практ. конф., Тамбов, 30 сент. 2013 г.: в 34 частях. Тамбов : Консалтинговая компания Юком, 2013. С. 160—161.

Материал поступил в редакцию 25.02.2015 г.

**УДК 81’367.2**

**Г. І.Ваўчок, С. М. Сарачынская**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## МЕТАДЫЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ СКАЗА ЯК АДЗІНКІ МОВЫ І МАЎЛЕННЯ

**Уводзіны.** Пры авалоданні рознымі раздзеламі беларускай мовы забяспечваецца гарманічнае маўленчае і лінгвістычнае развіццё асобы навучэнца, у тым ліку пры засваенні сінтаксісу.

У працэсе набыцця навучэнцамі сістэмных моўных ведаў і ўменняў, звязаных з апазнаваннем, адрозненнем, класіфікацыяй сінтаксічных адзінак, выдзяленнем іх з больш складаных структур, аналізам моўнага матэрыялу з мэтай вызначэння істотных прыкмет сінтаксічных з’яў і паняццяў, групоўкай сказаў па розных паказчыках, ажыццяўляецца мэтанакіраванае фарміраванне сінтаксічнага ладу пісьмовага і вуснага маўлення навучэнцаў.

У аснове засваення граматыкі ляжаць кагнітыўныя перадумовы, звязаныя як са значэннем, так і з формай выказвання. Пры гэтым на першае месца выходзіць значэнне, так як час і паслядоўнасць вывучэння асобных граматычных катэгорый залежыць ад іх значэння. У гэтым працэсе галоўная роля належыць сказу. Даследчыкі адзначаюць: «Авалоданне роднай мовай у асноўным і працякае ў выглядзе засваення сказаў розных тыпаў, ва ўсё большым ускладненні сказаў у адносінах колькасці ўключаемых кампанентаў (слоў) і шматлікасці ўзаемаадносін гэтых элементаў паміж сабой» [1].

**Асноўная частка.** Найбольш аптымальным і мэтазгодным для фарміравання сінтаксічнага ладу пісьмовага і вуснага маўлення навучэнцаў, як пачаткоўцаў, так і старшакласнікаў, з’яўляецца разуменне сказа як шматаспектнай сінтаксічнай адзінкі, якая характарызуецца сукупнасцю прымет. Сярод іх найбольш важнымі выступаюць структурныя і семантычныя ў дапаўненні лагічнымі і камунікатыўнымі ўласцівасцямі.

Для паспяховага фарміравання механізмаў маўлення навучэнцаў павінна адбывацца адначасовае засваенне і сінтаксічнай структуры, і таго сэнсавага зместу, які ў ёй заключаны. Таму і на першым этапе вывучэння сінтаксісу, і на наступных этапах дзейнасць навучэнцаў арганізуецца так, каб забяспечыць засваенне ўсяго комплексу прымет сказа як адзінкі мовы і маўлення. З гэтай мэтай можна выкарыстаць заданне «Прачытай».

© Ваўчок Г. І., Сарачынская С. М., 2015

Даецца тэкст: *«У лесе светла. Яркі месяц лье халодны блеск на заснежаныя паляны. Цішыня. На дрэвах цяжкія снегавыя шапкі. Яліны стаяць прама. Моцныя яловыя галіны трымаюць снег. А бярозы прыгнуліся пад цяжарам снегавога ўбору. Іх тонкія галінкі апусціліся да самых гурбаў».*

Навучэнцы павінны даць адказы на наступныя пытанні: ці можна гэты запіс назваць тэкстам? Чаму? Колькі слоў можа быць у сказе? Спішы частку тэкста пра яліны. Якія прыметы сказа ты ведаеш? Правер сябе: ці ўсе прыметы сказа названы?

Для матывацыі работы над тэкстам важнае значэнне мае маўленчая сітуацыя.

Напрыклад, пры стварэнні тэксту па тэме «Мой любімы ўрок» вучням прапаноўваецца скарыстаць наступны матэрыял:

1. сшытак, піша, вучань, урок, новы, на.
2. Квадратны ўрок лётае ў рацэ.
3. Сёння на ўроку вучні пісалі дыктант.
4. Вясновым ранкам дзеці спяшаюцца ў школу.

Спачатку неабходна адказаць на пастаўленыя пытанні: які з запісаў з'яўляецца сказам? Чаму? З якіх запісаў можа атрымацца сказ? Запішы сказы, якія ў цябе атрымаліся. Колькі ў гэтых сказах слоў? Знайдзі галоўныя члены ў сказе, а затым складзі і агуч тэкст.

Пры адказе звяртаецца ўвага на знешнія прыметы сказа (першае слова пішацца з вялікай літары, у канцы ставіцца адпаведны знак прыпынку) і на ўласцівасць выражаць закончаную думку.

Рэалізуючы прапанаваную маўленчую сітуацыю, выканайце наступныя заданні: «Падрыхтуйся скласці тэкст, які ўвойдзе ў зборнік вашага класа "Нашы любімыя ўрокі"».

Такія заданні садзейнічаюць больш прадуктыўнай рабоце па асэнсаванні ролі сказа ў тэксце.

Адной з умоў засваення зместу такога тэксту з'яўляецца ўсведамленне логікі развіцця думкі. Выявіць логіку дапамагаюць разнастайныя заданні: аналіз тэксту, пастаноўка пытанняў да тэксту, рэканструкцыя тэксту, г. зн. прадстаўленне вербальнай інфармацыі ў форме табліцы, схемы (мудрасць прыроды — казка зямлі — шарэнгі ахоўнікаў).

У старшых класах, разглядаючы тэму «Тыпы сказаў па мэце выказвання», можна выкарыстаць прыём «Зводная табліца», прымяненне якой дапамагае сістэматызаваць інфармацыю, правесці паралелі паміж з'явамі (табліца 1). Зводная табліца мае наступны выгляд:

Т а б л і ц а 1 — Зводная табліца па тэме «Тыпы сказаў па мэце выказвання»

| Апавядальныя сказы | Лінія параўнання | Пытальныя сказы |
|---|---|---|
| 1. Паведамляюць пра факт рэчаіснасці | 1. Мэта выказвання | 1. Заключаюць у сабе пытанне |
| 2. Спакойная, апавядальная | 2. Інтанацыя | 2. Пытальная |
| 3. Адносная закончанасці думкі | 3. Асаблівасці сказаў | 3. Патрабуюць адказ на пытанні |
| 4. Ставіцца кропка | 4. Знакі прыпынку | 4. Ставіцца пытальнік |

Асаблівая значнасць у курсе беларускай мовы надаецца фарміраванню інфармацыйных уменняў. У адпаведнасці з праграмай вучні павінны авалодаць навыкамі працы з вучэбнай інфармацыяй, прадстаўленай ў разнастайных формах (тэкст, малюнак, табліца, дыяграма, схема і г. д.). Напрыклад, табліца «Хто? Што? Дзе? Калі? Чаму?» запаўняецца ў час працы з інфармацыяй. На стадыі выкліку ідзе канструяванне тэксту па апорных словах (прырода, зямля, лес, заснежаны, абноўлены, стаіць, любіць, ахоўнік), абмеркаванне яго назвы. Стадыя асэнсавання патрабуе чытання тэксту невялікімі ўрыўкамі па пытаннях, змешчаных у табліцы. На стадыі рэфлексіі тэкст зноў уяўляе сабой адзінае цэлае. Найбольш эфектыўным на гэтым этапе з'яўляецца складанне сінквейна. Сінквейн — гэта свайго роду тэкст з пяці радкоў, уяўляе сабой сінтэз інфармацыі ў лаканічнай форме, што дазваляе апісаць сутнасць паняцця або здзейсніць рэфлексію на аснове атрыманых ведаў [2].

Тэкст.
Мастацкі, навуковы.
Раскрывае, малюе, інфармуе.
Складаецца з разнастайных сказаў.
Выказванне.

У ніжэй прапанаваным тэксце неабходна паставіць знакі прыпынку ў канцы кожнага сказа; растлумачыць, з якой мэтай выкарыстаны пытальныя сказы; перабудаваць пытальныя сказы ў апавядальныя, прааналізаваць, як змяняецца сэнс выказвання.

*Лес — гэта мудрасць прыроды і вечная казка зямлі Хто з нас не любіць вясновы абноўлены лес Хто ў летнюю спёку не спяшаўся ў прахалоду ляснoй дубравы Хто сумнай восенню не захоча палюбавацца пазалотай бяроз, яркім полымем чырвонай рабіны Хто заснежанай зімой адмовіцца прабегчы на лыжах па іскрыстым снезе, убачыць святочны брыльянцісты ўбор Магутнымі шарэнгамі стаіць лес, ахоўваючы ворныя землі, затрымліваючы шкодныя пяскі, аберагаючы берагі ад выветрывання і разбурэння.*

Пры вывучэнні граматыка-арфаграфічных тэм працягваецца работа над асэнсаваннем прымет тэксту, сказа, дзе прапаноўваюцца наступныя пытанні: якія тыпы сказаў сустрэліся ў тэксце? Якія тыпы сказаў дапамаглі аўтару раскрыць значымасць лесу?

**Заключэнне.** Як бачым, для ўдасканалення аналітычных і канструктыўных уменняў навучэнцаў разгляд сказаў рознай канструкцыі ажыццяўляецца на тэкставай аснове, каб забяспечыць усведамленне навучэнцамі сказа не толькі як самастойнай, сінтаксічнай адзінкі, але і як структурнага кампанента канкрэтнага маўленчага твора. Аналіз сказаў у тэксце дазваляе разглядаць сінтаксічную адзінку ў трох аспектах: структурным, семантычным, камунікатыўным. Такі падыход забяспечвае пераход ад інтуітыўнага валодання мовай да ўсвядомленага і камунікатыўна мэтазгоднага выкарыстання сказаў рознай структуры і семантыкі ў асабістым маўленні.

### Спіс цытаваных крыніц

1. Буланова С. Ю. Методические подходы к изучению синтаксиса русского языка // Нач. шк. 2015. № 2. С. 27—30.
2. Булахова З. Н. Применение технологии развития критического мышления на уроках русского языка и литературы // Нар асвета. 2004. № 9. С. 15—19.

Матэрыял паступіў у рэдакцыю 11.05.2015 г.

**УДК 378.147**

**Ж. А. Головко**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи*

## ФОРМИРОВАНИЕ КОММУНИКАТИВНОЙ КОМПЕТЕНТНОСТИ БУДУЩИХ ПЕДАГОГОВ НА ЗАНЯТИЯХ ПО МЕТОДИКЕ ПРЕПОДАВАНИЯ РУССКОГО ЯЗЫКА И ЛИТЕРАТУРНОГО ЧТЕНИЯ

**Введение.** Известно, что формирование коммуникативной компетентности педагогов начинается в учреждении высшего образования. Для этого необходимо предоставить студентам возможности применить речь для осуществления коммуникации. Эту возможность определяет, на наш взгляд, организация отдельных видов речевой деятельности на занятиях по методике. Важным условием в такой деятельности является мотивационный компонент [1].

Предпосылкой всякой речевой деятельности, по А. Н. Леонтьеву является та или иная потребность. В качестве источника, пускового механизма речевой деятельности выступает коммуникативная или коммуникативно-познавательная потребность вступить в общение с собеседником, автором публикации или справочника через его материал, с писателем — через книгу, с поэтом — через его стихотворения, выразить свои эмоции и чувства, разделить их с собеседником [2].

Поэтому, прежде чем дать задание ученикам на создание или восприятие высказывания (сочинения, изложения), необходимо обеспечить у них возникновение этой потребности, желания вступить в речевое общение.

**Основная часть.** Предлагая ученикам задание создать текст, учитель должен обеспечить речевые ситуации, чтобы школьники «заговорили на тему», написали сочинение с желанием. Сочинение и будет конечной целью, предметом речевой деятельности. А речевая деятельность — это процесс приёма или выдачи речевого сообщения в ходе общения людей друг с другом. Она может быть осуществлена при желании высказаться, наличии языковых средств (лексико-грамматического материала) и при владении необходимыми способами действий (методических заданий). Продуктом такой деятельности и стал «Справочник для проведения творческих работ в начальной школе», а результатом будет его использование о соответствии с замыслом будущего сочинения (изложения) [3].

В связи с этим нами было организовано коллективное творческое дело — проект «Творческая лаборатория учителя начальных классов» на базе студенческой группы. Одной из составляющих этого проекта было создание справочно-методических материалов для ученических творческих работ в школе по теме «Времена года». Цель создания такого справочника — помочь ученику (на практике) и учителю организовать речевую деятельность; создать возможность для предельно самостоятельной работы ученика при подготовке к творческим работам [4].

© Головко Ж. А., 2015